УДК 821.161.3.0

# Эвалюцыя жанру драматычнай паэмы ў творчай спадчыне Янкі Купалы

**Г.П. Харошка**

*Прасочваецца эвалюцыя жанру драматычнай паэмы ў творчасці Янкі Купалы. На аснове твораў "Адвечная песня", "Сон на кургане" і "На папасе" раскрываецца драматычны талент паэта. Падкрэсліваецца, што вытокі драматычнага жанру зыходзяць з лірычных вершаў, дзе выразна відаць драматычны элемент, увасоблены ў форме маналогаў і дыялогаў, якія займалі значнае месца ў жанравым рэпертуары аўтара. Зварот да жанру драматычнай паэмы быў выкліканы самім характарам творчасці Я. Купалы. "Тэатральнасць" стылю, дэкламацыйна-размоўная інтанацыя, напружанасць думкі – усё гэта падказвала і набліжала "выхад" аўтара да жанру драматычнай паэмы. Жанравыя пошукі найбольш выразна адбіліся ў "Адвечнай песні" і "Сне на кургане", дзе ў наяўнасці не толькі ўся эстэтыка літаратурнага жанру, але і энцыклапедычная паўната жыцця беларускага сялянства на пераломе XIX–XX стст.*

Зараджэнне драматычнай паэмы ў нацыянальнай літаратуры звязана, у першую чаргу, з імем класіка беларускай літаратуры Янкі Купалы, які ў свой час даў цудоўныя ўзоры драматычных твораў – "Адвечная песня" (1908) і "Сон на кургане" (1910). Праўда, аўтар спрабаваў пісаць і трэцюю паэму "На папасе", але, на жаль, яна не была завершана. Гэта быў свайго роду лагічны працяг у стварэнні драматычнага жанру, хоць аўтар і не рэалізаваў задуманае да канца. Па змесце паэт стварыў толькі адну карціну ("абразок"), у якой праступаюць рысы грамадскай атмасферы на Беларусі ў час рэвалюцыі 1905–1907 гг. Засяродзім увагу на першых дзвюх паэмах Купалы "Адвечная песня" і "Сон на кургане", якія маюць сваю жанравую завершанасць. Менавіта ў гэтых творах выразна прасочваецца эвалюцыя драматычнай паэмы. Ужо сам факт з'яўлення высокіх формаў драматычнага мастацтва – немалаважная і выключная падзея ў тагачаснай беларускай літаратуры, якая смела пайшла ў глыбіню народнага жыцця. Гэта тое нараджэнне, – падкрэслівае літаратуразнаўца М. Арочка, – якое сведчыць пра вялікія духоўныя сілы народа, пра здольнасць якасна трывалага запаўнення гістарычных "прабелаў", а значыць і эстэтычнага далучэння да сусветнай літаратуры" [1, с. 177].

З выхадам у свет вядомых купалаўскіх твораў, несумненна, пашырыліся і ўзбагаціліся жанрава-эстэтычныя магчымасці нацыянальнай паэмы ўвогуле. Больш таго, творы Янкі Купалы давалі падставы сцвярджаць пра жыццяздольнасць драматычнай паэмы ў нацыянальнай літаратуры. Але перш чым гаварыць пра жанр драматычнай паэмы ў творчасці Купалы, трэба ведаць тыя жанрава-эстэтычныя крытэрыі, якія даюць права называць драматычныя творы паэмамі. У гэтым выпадку спашлёмся на выказванні аўтарытэтных вучоных-тэарэтыкаў літаратуры. Найбольш прымальна і поўна гэтае пытанне разглядаецца М. Арочкам і М. Лазаруком. Даследуючы асаблівасці жанру паэм, М. Арочка, у прыватнасці,

сцвярджае: “Драматычная паэма выпрацавала і замацавала ўстойлівыя жанравыя прыкметы. Яе ўнутраная якасць: канфліктна-напружанае сутыкненне характараў, маральна-этычных пазіцый, ідэалаў, што складае асноўную драматычную “спружыну” твора. Уласціва ёй і маналагічна-дыялогавая форма самавыяўлення герояў, а праз іх – разгортванне дзеі” [2, с. 354]. Драматычная паэма, далей зазначае М. Лазарук, “моцна адрозніваецца сваёй унутранай сутнасцю, асабліва ў падыходзе да паказу герояў” [3, с. 72]. “Ёй характэрна павышаная эмацыянальная дынаміка, драматызм вялікіх гістарычных падзей, такі, што ўзнікае ў выніку канфліктаў, якія маюць агульнанародны сэнс” [3, с. 13]. Якраз такія жанрава-эстэтычныя якасці прысутнічаюць у драматычных паэмах “Адвечная песня” і “Сон на кургане” Янкі Купалы.

Неабходна заўважыць, што Я. Купала не адразу звярнуўся да лірыка-драматычнага эпасу. Як вядома, паэт пачаў з лірычных вершаў, але эвалюцыя жанру, ішла ў яго па шляху накаплення перш за ўсё драматычных элементаў. Успомнім самую раннюю лірыку паэта, дзе вастрыня пачуццяў, страсцей, перажыванняў нярэдка ўвасаблялася ў форме маналогаў і дыялогаў, якія займалі значнае месца ў яго жанравым “рэпертуары”. Часта верш паэта будаваўся як страсны маналог лірычнага героя, як спрэчка са сваім унутраным “Я”. Зварот да жанру драматычнай паэмы быў выкліканы самім характарам творчасці Я. Купалы. “Тэатральнасць” стылю, дэкламацыйна-размоўная інтанацыя, якая ўзмацнялася з кожнай вершаванай кніжкай – усё гэта падказвала і набліжала “выхад” аўтара да жанру драматычнай паэмы. Гэтаму садзейнічала таксама схільнасць Купалы да абвостранага ўспрыняцця рэчаіснасці ў багацці яе жыццёвых кантрастаў і настрояў, да адлюстравання герояў з моцнымі пачуццямі і страсцямі.

Драматычная паэма, як вядома, – вынік праяўлення драматычнага светаадчування, характэрнага яркай творчай індывідуальнасці. Менавіта “прырода таленту, – далей развівае сваю думку М. Арочка, – вельмі моцна ўплывае на прыроду жанру… Але поспех твораў залежыць не толькі ад ступені талантлівасці аўтара, але і прама ці апасродкавана ўвасобленых якасцей яго асобы, ад буйнай, мужнай творчай асобы, якая актыўна сцвярджае сябе, умее пастаяць за свае перакананні” [1, с. 63]. Гэта ў поўнай ступені адносіцца і да Янкі Купалы, які ўвайшоў у беларускую літаратуру не толькі як глыбокі лірык, але і як незвычайны эпік.

Эпічны талент паэта засведчыў сваю прыроду менавіта ў драматызме светаўспрымання, якім адзначаны ўжо раннія паэмы “Зімою”, 1906, “Нікому”, 1906, “Калека”, 1907, “Адплата кахання”, 1907, “У ціліпаўку”, 1908, “За што”, 1909). У гэтых творах знайшлі сапраўднае мастацкае адлюстраванне жывыя пласты рэчаіснасці таго часу. Паэт выкарыстаў простыя віды апавядальнасці (гаворка ішла пра горка-праўдзівыя лёсы людзей) у спалучэнні з разнастайнымі формамі ёмкіх умоўна-асацыятыўных абагульненняў.

Жанравыя прызнакі драматычнай паэмы найбольш выразна праявіліся ў “Адвечнай песні” і “Сне на кургане”, дзе ў наяўнасці не толькі ўся эстэтыка літаратурнага жанру, але і энцыклапедычная паўната жыцця беларускага селяніна на пераломе XIX–XX стст. М. Ярош, адзін з даследчыкаў творчасці Я. Купалы, пісаў: “Зварот паэта да жанру драматычнай паэмы тлумачыцца імкненнем да шматграннасці багацця свету, да пашырэння даляглядаў роднай

літаратуры” [5, с. 101]. Гэтыя паэмы з’яўляюцца вынікам глыбокіх роздумаў паэта аб шляхах беларускага народа да лепшай долі. Жанр драматычнай паэмы стаў для Купалы ў сваім родзе першай сур’ёзнай спробай вырашыць у буйнамасштабных творах пытанне пераходу сялянства да разумення неабходнасці сацыяльнай актыўнасці. Час, калі стваралася паэма, быў вельмі нялёгкі. Гэта былі змрочныя дні жорсткай рэакцыі пасля паражэння рэвалюцыі 1905–1907 гадоў. Самі абставіны – і агульныя, і ўнутраныя – прымусілі Купалу шукаць адпаведныя жанравыя формы, якія былі б здольны перадаць сацыяльную і маральна-эстэтычную сутнасць рэчаіснасці. І не толькі адзін Купала сутыкнуўся з гэтай праблемай. Уся тагачасная беларуская літаратура стаяла перад неабходнасцю набыць такую паэтычную форму мастацкага абагульнення, якая ўключала б не проста праўдзівыя “малюнкі жыцця”, але і яе філасофскі, духоўны сэнс і змест. І такой формай аказалася драматычная паэма. Яна, па словах таго ж М. Яроша, стала ў творчасці Купалы своеасаблівай як “па характару настрою”, так і “па раскрыццю вобразаў, па жанравых адзнаках” [6, с. 25].

У тых гістарычных абставінах, далей адзначае М. Лазарук, “драматычныя паэмы былі жанрам вельмі адпаведным, “прыдатным” для пастаноўкі і рашэння праблем сацыяльнага і нацыянальнага жыцця беларускага народа той эпохі” [3, с. 73]. Гэтая форма дала Купале мажлівасць з неабходнай паўнатой выказаць свае погляды, даць ацэнкі падзеям, якія адбываліся, падзяліцца сваімі сумненнямі адносна перспектыў сацыяльна-гістарычнага працэсу. Сведчаннем таму з’явілася драматычная паэма “Адвечная песня”, названая Р. Бярозкіным “рэччу эпахальнага значэння як для самога Купалы, так і для беларускай літаратуры” [7, с. 92]. Па задуме аўтара, “Адвечная песня” – твор алегарычны з філасофскім напаўненнем. Неабходна адзначыць, што вобразы-сімвалы займаюць у паэме значнае месца. У творы персаніфікуюцца поры года і абстрактныя паняцці – як жывыя “ўвасобленыя” істоты дзейнічаюць Жыццё, Доля, Холад, Вясна, Лета і г.д., якія ўключаны ў напружаныя роздумы аўтара аб сэнсе і прызначэнні чалавечага жыцця. Гэтая асаблівасць гаворыць аб глыбокай народнасці паэзіі Я. Купалы. Сімволіка ў “Адвечнай песні” вырастае з самой рэчаіснасці; будучы рэалістычнай па самой сваёй прыродзе, яна ідзе ад жыцця і народнай творчасці і не заключае ў сабе нічога ірэальнага, звышнатуральнага. Створаныя ў паэме сімвалічныя вобразы ўвасабляюць страшныя сілы тагачаснай рэчаіснасці, тыя беды, што з ўсіх бакоў падпільноўвалі мужыка. Яны дапамагаюць стварыць фон і абставіны дзеяння, узмацняюць псіхалагічную пераканальнасць учынкаў галоўнага героя паэмы – Мужыка, які з’яўляецца галоўным правадніком ідэі твора. У чым яна заключаецца? Па сэнсе гэта паэма аб спрадвечным горы селяніна, яго нялёгкай працы, сацыяльных крыўдах, жыццёвых пакутах, якія з пакалення ў пакаленне заставаліся яму прадвызначанымі самім лёсам. У цэнтры паэмы – жыццё звычайнага чалавека, які жыве ў свеце, заснаваным на прыгнёце і эксплуатацыі. З самага нараджэння яму прадказвалі шчаслівую будучыню, што “ён будзе ўсіх чыста дужэй, ён будзе ўсіх чыста мудрэй. І рэкі, і долы, і горы яго будуць слухаць з пакорай” [8, с. 7–8]. Аднак прароцтвы аказаліся далёкімі ад рэальнасці. З самага дзяцінства селянін – і мы гэта бачым – асуджаны на няшчасці і пакуты. Варожыя сілы, персаніфікаваныя ў вобразы Жыцця, Долі, Бяды, Холада, Старасты, Магільшчыка, калечаць лёс мужыка, асуджаюць на беднасць, галечу, пагібель. Аднак нельга пагадзіцца, што герой “Адвечнай песні” цалкам падпарадкаваны сваёй долі, што ён толькі “несвядомы, пасіўны” [9, с. 160], як гэта

сцвярджае І. Шотт. На наш погляд, у купалаўскай паэме можна ўбачыць нешта супрацьлеглае. Герой паўстае ўнутрана актыўнай, патэнцыяльна свядомай асобай, у яго душы паступова наспявае абурэнне, пратэст супраць сацыяльнай і нацыянальнай несправядлівасці. Селянін задумваецца над сваім беспрасветным становішчам: “Дзе ж мой дом? дзе ніва?”, “А дзе шчасце тое” [8, с. 20–21], “Апрацівела гора, жыццё” [8, с. 22], “І дакуль так будзе” [8, с. 32] – настойліва гучыць голас бедняка. А гэта гаворыць аб тым, што паэт у “Адвечнай песні” шукае шляхі духоўнага вызвалення чалавека з-пад ціску ўласнасці і ўсеагульнай адчужанасці. Не раз Мужыку хацелася “пусціць у ход сталёвую касу”, каб з дапамогай яе здабыць “шчасце новае”. А. Лойка справядліва падкрэслівае: “Ён (селянін. – Х.Г.) настойліва прагне яго сабе, сваім дзецям і ўсім людзям, што нават з “таго свету” вяртаецца, паўстае ценню над уласнай магілай, каб даведацца, ёсць ці, нарэшце, шчасце ў мужыка” [10, с. 28]. Аднак, прыгнечаны цяжкім жыццём, мужык не змог узняцца да актыўнай барацьбы за “шчасце новае”. Ён толькі скардзіўся на злую мужыцкую долю, спадзяваўся дачакацца карэнных сацыяльных перамен. Светапогляд мужыка быў абмежаваны аб’ектыўнымі і суб’ектыўнымі фактарамі. Герой асуджае не жыццё ўвогуле, а жыццё пры тагачасным сацыяльна-палітычным ладзе, пры якім лёс чалавека рабіўся неймаверна цяжкім. Такім чынам, Я. Купала на прыкладзе жыцця адной асобы, выкарыстоўваючы магчымасці мастацкага абагульнення, якія яму прадстаўляла драматычная паэма, намаляваў карціну трагічнага становішча беззямельнага сялянства. Зразумела, можна пашкадаваць, што вобраз Мужыка ў “Адвечнай песні” атрымаўся недастаткова індывідуалізаваным, як робяць некаторыя даследчыкі. Але індывідуалізацыя тут не была мэтай для паэта. У такім выпадку ўзнікае пытанне: чаму Купала не імкнуўся да паглыбленай матывацыі вобраза, яго мовы, учынкаў? Больш таго, у “Адвечнай песні” ў значнай ступені адсутнічаюць звычайна характэрныя для драматычнай паэмы дынамічнасць дзеяння, канфліктнасць характараў і г.д. У гэтым выпадку, на наш погляд, неабходна зыходзіць з іншага. Гэта не адыход Купалы ад абранага ім жанра, а “паварот” яго да новых патрабаванняў. Паэт у “Адвечнай песні” ставіў перад сабой больш агульныя задачы: паказаць сацыяльна-гістарычнае, грамадска-класавае становішча ўсяго беларускага сялянства ў пачатку ХХ стагоддзя. Па словах М. Лазарука, у паэме “намаганні аўтара накіраваны не на выяўленне характараў, маральных, псіхалагічных супярэчнасцей, а на паказ супярэчнасцей сацыяльных”. І далей: “Гэта не драматызм канкрэтнай сітуацыі, не індывідуальна-псіхалагічны драматызм, а драматызм лёсу цэлага народа, гэта паэмны драматызм” [11, с. 143, 146]. Купала сродкамі мастацкай тыпізацыі імкнуўся паказаць канфлікт паміж грамадскім назначэннем чалавека і яго рэальным становішчам у капіталістычным свеце, канфлікт, які стварае драматычны і сюжэтна-кампазіцыйны стрыжань паэмы. Што да характару Мужыка, то ён, як мы бачым вышэй, у паэме прысутнічае, неадлучны ад народа, зліты з яго лёсам. Гэты вобраз увабраў у сябе ўвесь грамадска-палітычны змест важнейшых тэндэнцый духоўнага стану эпохі.

Варта адзначыць, што Купала, ствараючы “Адвечную песню”, не абмежаваўся крытычным пафасам, у святле якога глыбока агаліўся трагізм жыццёвых шляхоў Мужыка. Станоўчую ролю ў адлюстраванні рэалістычных старонак жыцця, у стварэнні рамантычных вобразаў адыгралі традыцыі нацыянальнага фальклору, якія з самага пачатку, поруч з самой рэчаіснасцю, актыўна жывілі творчую душу паэта, яго мастацкі

пошук. Паэт не капіруе ўзоры народных здабыткаў, ён не збіваецца на простае стылізатарства. У паэме мы не бачым нават лаканічных установак ці рэмінісцэнцый – усе памкненні Купалы зводзяцца да абнаўлення традыцыйных вобразаў, паглыблення іх псіхалагічнай значнасці і сімвалічнай накіраванасці. Такое творчае асэнсаванне багацця фальклорных традыцый дало мажлівасць паэту глыбока падкрэсліць трагізм жыцця беларускага селяніна, пранікнуць у яго духоўны свет. У "Адвечнай песні" прысутнічаюць персаніфікаваныя традыцыйныя фальклорныя вобразы Долі, Голаду, Холаду, Бяды і інш., якія нясуць пэўную сэнсавую нагрузку. Дзякуючы ўвядзенню ў тканіну паэмы фальклорных персанажаў і прыродна-паэтычных сімвалаў, твор, не губляючы канкрэтна-гістарычных прыкмет, набыў вялікую прасторава-часавую, філасофскую глыбіню і працягласць. Фальклорныя персанажы ў гэтым выпадку садзейнічаюць больш моцнаму раскрыццю "варожасці і трагічнай неакрэсленасці тых абставін, якія супрацьстаяць чалавеку і якія па сутнасці пярэчаць адвечным законам самога жыцця" [12, с. 234]. Акрамя таго, у "Адвечнай песні" Купала паспяхова выкарыстоўвае пры стварэнні сістэмы вобразаў песенную творчасць беларускага народа – абрадавую паэзію. Напрыклад, у сцэнах вяселля, касьбы, дзе народны характар выяўляецца з асаблівай паўнатой. Бадзёрасць і натхненне, вясёлая вынаходлівасць, пачуццё гумару, цвярозасць "погляду на рэчы" сімвалізуюць тут душэўную шчодрасць народа. Аднак традыцыйны фальклор у "Адвечнай песні" выкарыстаны Купалам у другім эстэтычным значэнні: з яго дапамогай паэт прыкметна ўзмацняе кантраснасць характараў, драматычныя сітуацыі. А гэта, у сваю чаргу, вяло да ўзбагачэння драматычнай паэмы. Хоць, як нам здаецца, па жанравых прызнаках, па характары развіцця сюжэту і па асаблівасцях кампазіцыйнай будовы "Адвечная песня" вельмі блізкая да лірыка-эпічнай паэмы і адрозніваецца ад яе драматызаванай формай. Усё-такі твор належыць да жанру драматычнай паэмы, таму што ў ёй – своеасаблівы сінтэз эпічнага матэрыялу і драматычнай формы з лірычным напаўненнем тэмы. Эвалюцыя жанру драматычнай паэмы ў Купалы ішла па шляху накаплення напружаных сцэн і сітуацый. Гэта прыкметна адчуваецца і ў паэме "Сон на кургане", своеасаблівым працягу тэмы "Адвечнай песні" (але не ў рамантычнай паэме "Курган", як гэта можна прачытаць у кнізе І. Шотт) [9]. Аднак твор "Сон на кургане" хоць і блізкі па тэматыцы, эстэтычным прынцыпам да "Адвечнай песні", разам з тым ён істотна адрозніваецца наяўнасцю драматычна напружаных сцэн, рухомасцю дыялогаў як увасаблення валявых намаганняў і барацьбы дзеючых асоб. Твор напісаны ў гісторыка-філасофскім ключы, ускладнены сімволіка-алегарычнымі малюнкамі і вобразамі незвычайнай сюжэтна-кампазіцыйнай структуры. Паэма, як адзначае Р. Бярозкін, "з відавочнай устаноўкай (праўда, не рэалізаванай да канца) на сінтэз, на зліццё "духоўнага" і "эмпірычнага" [7, с. 143]. У адрозненне ад "Адвечнай песні", паэма "Сон на кургане" "населена" фальклорна-фантастычнымі персанажамі, хоць не гэта вызначае яе сэнс. Галоўнае ў тым, што Я. Купала апавядае ўсё аб людзях, аб іх працы, поўным трагізме жыцця, аб пошуках народам запаветнага скарба – свабоды.

У гэтай паэме аўтар мацней паэтызуе барацьбу супраць сацыяльнага зла. Мае рацыю І. Навуменка, калі піша, што "Сон на кургане" – гэта "роздум паэта аб лёсе беларускага вызваленчага руху, аб шляхах барацьбы народа, які ў рэвалюцыі шукаў ажыццяўлення сваіх

сацыяльных і нацыянальных надзей" [10, с. 569]. У гэтым творы Купала імкнуўся адказаць на пытанне аб узаемаадносінах асобы і народных мас, а таксама паказаў жаданне цёмных сіл рэакцыі настроіць народ супраць лепшых яго прадстаўнікоў – рэвалюцыйных кіраўнікоў. Такім рамантычна настроеным праўдашукальнікам у паэме з'яўляецца Сам. Нягледзячы на некаторую ўмоўнасць гэтага вобраза, ён сведчыць, што і ў часы рэакцыі Купала паслядоўна выражаў ідэі барацьбы за лепшае будучае, што і зараз ён імкнуўся стварыць вобразы абаронцаў народных інтарэсаў. Неабходна шукаць праўду, змагацца за яе – такую думку сцвярджае паэт вобразам Сама. Па меры развіцця дзеяння ўсё паўней і ярчэй вымалёўваецца аблічча гэтага героя, яго маральная чысціня і сіла. Усё, што робіць Сам, робіцца ім дзеля людзей. У адрозненне ад Мужыка з "Адвечнай песні", Сам – цэласная натура. Некаторыя даследчыкі з залішняй катэгарычнасцю адносілі вобраз Сама да разраду песімістычных герояў (Я. Мазалькоў). Аднак такую ацэнку варта лічыць надта павярхоўнай і неглыбокай. Развіццё вобраза (духоўны, маральны рост героя) дакладна прасочваецца ад сцэны да сцэны. Калі ў пачатку ён ледзь пазначаны, то далей набывае выразныя контуры.

У адрозненне ад героя "Адвечнай песні", Сам дзейнічае па сваёй ініцыятыве, ён адкрываецца перад нашым поглядам ва ўсёй душы, у складанасцях і супярэчнасцях. І як бы драматычна ні складваўся лёс Сама, ён у паэме заўсёды, як, па іншаму выпадку, гаварыў Гегель, "у адзінстве з сабою", г.зн. кожная рыса яго паводзін, яго думак і страсцей зыходзіць з жывой індывідуальнасці, якая ўласціва толькі аднаму яму. У паэме Сам – асоба самастойная, ён гатовы паступіць так, як толькі ён і можа паступіць, беручы на сябе ўсю адказнасць за свой учынак і за свае думкі. Сам рашуча шукае адказ на галоўнае пытанне: як далей жыць? "Як знайсці к скарбу дарогу" [8, с. 71]. Сам дзейнічае па сваёй ініцыятыве, паўстае перад нашым поглядам у своеасаблівасці думак і ўчынкаў, у глыбінных перажываннях сваёй душы, у складанасцях і супярэчнасцях. У адзінстве ўсіх гэтых уласцівасцей і багацця – цэласны драматычны характар героя.

У вобразе Сама гісторыя, магчыма, упершыню ўваходзіць у паэзію Купалы ў сваім абагулена-філасофскім гучанні як паэтычная канцэпцыя трагічных лёсаў беларускай нацыі. Чалавек тут ужо не пабочны назіральнік гісторыі, не стаячы над ёй асветніцкі розум, а часцінка гэтага трагічнага свету. Гэта – свет вялікіх пакут усіх істот, якія знаходзяцца пад злой уладай прывідаў і Чорнага. Міфалагічныя істоты ў форме прывідаў патрэбна разумець у паэме як памочнікаў Чорнага ў яго цёмнай справе, паслухмяных выканаўцаў яго волі. Гэта – увасабленне ўсіх змрочных грамадска-палітычных сіл, надзейныя ахоўнікі Чорнага. А Чорны ў паэме – сімвал улады, бязлітасны, грубы і разбуральны. Свет, дзе пануюць законы Чорнага, – гэта свет, у якім пануе смерць, забойства, кроў. Царства Чорнага – гэта "царства золата і эксплуатацыі, царства цемры і ашуканства" (М. Ярош). Ён сцеражэ спрадвечны скарб – агульнае, "радавое" багацце, створанае народам на працягу многіх вякоў. Гэта каштоўнасці, адчужаныя ад людзей працы. За гэтым скарбам знаходзіцца скупленая за бясцэнак зямля, праца селяніна, яго жыццё і духоўная годнасць. Чорны не дапускае думкі, што чалавек можа стаць гаспадаром гэтага скарба. Паміж Самам і Чорным узнікае канфлікт, так сказаць, асноўны драматычны вузел – пачынаецца ўпартая, жорсткая барацьба паміж Самам і Чорным, за якімі бачыцца дзве сімвалічныя супярэчлівыя сілы.

Сам

Вось і тапор мой. К рабоце жывей!
Скарб дастаць мушу я гэты;
Ласкай павее тады ад людзей,
Неба і цэлага свету

Чорны

Ты зноў сюды лезеш, няшчасны!
Ха-ха-ха! вось так навала!
Напрасна, мой мілы, напрасна
Зноў цябе немач прыслала.
Не дам я да скарбаў дастацца,
Варту я моцну трымаю,
Хто важыцца з мною змагацца
Помач я крэпкую маю [8, с. 66].

Гэтыя сілы не проста супрацьпастаўлены ў паэме, яны дадзены ў актыўным супрацьстаянні, у напружанай барацьбе, ва ўзаемным адмаўленні, у імкненні кожнай з іх да самасцвярджэння. Канфлікт, які ўзнік паміж Самам і Чорным, у значнай ступені абумоўлівае сюжэтна-кампазіцыйную пабудову твора, групоўку персанажаў ў ім, жанравыя асаблівасці. Ён дапамагае выявіць сучасныя пачуцці, імкненні Сама і раскрыць сапраўдныя задумы Чорнага. Галоўны герой знаходзіцца ўвесь час у дзеянні. Ён прагне скарбу – свабодай, прынесці людзям шчасце. У сілу сваіх палітычных і маральных перакананняў Сам – незвычайная асоба, ён – сканцэнтраванне велічных гуманных пачаткаў, абуджаных у свядомасці чалавека; ён у дадзеным выпадку "выступае ўжо ў іншай якасці, становіцца народным заступнікам" [11, с. 134]. Гэты вобраз увасабляе рысы героя, які жадае аб'яднаць тых, хто яго слухае, на святую барацьбу за народную праўду, за высокія ідэалы сацыяльнага і нацыянальнага вызвалення.

Важна падкрэсліць, што ўзмацненне сімволіка-алегарычнай плыні, паглыбленне сацыяльна-філасофскіх асноў у паэме ідзе таксама за кошт фальклорных уплываў. Арыентацыя на традыцыйную народную абраднасць і сімволіку надае паэме "Сон на кургане" непаўторны нацыянальна-самабытны каларыт і арыгінальнасць. Як і "Адвечная песня", "Сон на кургане" нясе ў сабе відавочныя стылёвыя асаблівасці паэтычных жанраў фальклору. Асабліва плённым аказалася выкарыстанне фальклорных традыцый пры стварэнні сімволіка-алегарычных сцэн у першых частках паэмы "Сон на кургане". У прыватнасці, глава "У пушчы" цалкам вырасла на народнай міфалогіі. Тут Купала адлюстраваў цэлую чараду міфалагічных істот: русалак, ахоўнікаў ляснога царства. Праз традыцыйна рамантычную трактоўку народных міфаў Купала імкнецца раскрыць у паэме сацыяльна-эстэтычныя вытокі асабістай драмы чалавека. Акрамя таго, фантастычныя, міфалагічныя істоты выкарыстоўваюцца Купалам у паэме галоўным чынам як сродак складанага драматычнага развіцця дзеяння. І разам з тым узмацняецца рамантычная вобразнасць твора. Па-майстэрску пераасэнсоўвае Купала ў паэме "Сон на кургане" паданні, легенды, казкі, шырока ўводзіць у

канву сюжэта народна-песенную паэзію і іншыя элементы фальклорнай паэтыкі. А гэта станоўча адбіваецца не толькі на характары апавядання, але і на асаблівасцях жанра, на прынцыпах псіхалагічнага аналізу герояў купалаўскай драматычнай паэмы.

Драматычная паэма "Сон на кургане" па сваёй ідэйнай задуме, па сюжэтна-кампазіцыйнай пабудове складаная і шматпланавая. Невыпадкова адны даследчыкі адзначалі філасофскую сімволіку, глыбіню абагуленасці твора (І. Навуменка), другія – купалаўскую іронію (М. Лазарук), трэція – сацыяльна-гістарычную сутнасць паэмы (М. Ярош), чацвёртыя – моўныя і ўмоўна-асацыятыўныя асаблівасці (М. Арочка) і г.д. Усё разам узятае, безумоўна, дапаўняе і прасвятляе вобразны лад паэмы "Сон на кургане", яе ідэйна-маральны пафас.

Разам з тым даследчыкі творчасці паэта ў сваіх выказваннях чамусьці апускаюць адну немалаважную дэталь – жанравую спецыфіку твораў. У адрозненне ад "Адвечнай песні" "Сон на кургане" па сваёй будове прыкметна адрозніваецца знешнімі і ўнутранымі якасцямі: па-першае, наяўнасцю драматычна напружаных сцэн і своеасаблівым іх чаргаваннем ("На замчышчы"); па-другое, хуткай зменай падзей, якія развіваюцца бурна, без якіх-небудзь перашкод. Асобныя сцэны носяць па-сапраўднаму драматычны характар ("На пажарышчы"); па-трэцяе, больш актыўнымі і жывымі сталі маналогі і дыялогі герояў, пры дапамозе якіх сцэны набываюць сапраўдны эмацыянальна-драматычны эфект. Як пацвярджэнне гэтай думкі можна нагадаць сцэну з удзелам Сама са сваімі бацькамі і жонкай:

Старая
А!.. сынок мой, ці ж ты збрыдаў
Хаткай, намі так без жалю?

Стары
Ці то праўда, што казалі?

Старая
Усё бацькам сказаць павінен.

Сам
Хоць зарэшце, я не вінен:
На начлезе быў… З папару
Ратаваць бег ад пажару,
А яны мяне…

Нявестка
Што ж міленькі, цяпер будзе?
У ссылку могуць засудзіці.
А мне хоць ідзі ў свет з дзіцём [8, с. 119].

У прыведзеным прыкладзе асноўную ўвагу Купала ўдзяляе псіхалагічнай характарыстыцы персанажаў. Дыялог пабудаваны па ўсіх законах драма-паэтычнага мастацтва. Ён жывы, дзейсны, актыўны і драматычна напружаны. Структура дыялогаў стала ў паэме больш ушчыльненай, кароткія вершаваныя сказы надаюць твору асаблівую дынаміку дзеяння. Да асаблівасцей драматычнай паэмы Я. Купалы "Сон на кургане"

можна аднесці і тое, што ў цэнтры твора стаіць толькі адзін вобраз. Адлюстроўваючы ўчынкі цэнтральнага героя, раскрываючы яго думкі і жаданні, паэт адначасова паглыбляе ідэю твора. Таму пабудова сюжэта, кампазіцыйная арганізацыя матэрыялу паэмы падпарадкаваны выяўленню характару і светапогляду галоўнага героя.

Не апошняя роля ў "Сне на кургане" адводзіцца рэмаркам, без якіх, на наш погляд, паэма губляла б паўнату сюжэтнага і сэнсавага абагульнення. Яны ў значнай ступені служаць не толькі для ўзмацнення інфармацыйнасці, колькі даюць мажлівасць чытачу больш глыбока пранікнуць ва ўнутраны свет герояў, больш поўна зразумець абставіны, якія адбываюцца.

Такім чынам, пабудова сюжэту, кампазіцыйная арганізацыя матэрыялу, правільны выбар драматычнага героя, а таксама майстэрская пабудова дыялогаў і ўнутраных дыялогаў, старанная апрацоўка моўнай характарыстыкі персанажаў двух твораў, а заадно і глыбокая сэнсавая роля аўтарскіх рэмарак – усё гэта гаворыць аб Я. Купале як аб вялікім, сталым мастаку, які ўмеў карыстацца магчымасцямі драматычнай паэзіі.

Тут нельга не адзначыць і той факт, што Я. Купала, ствараючы драматычныя паэмы "Адвечная песня" і "Сон на кургане", не мог не ўлічваць вопыт і традыцыі сваіх папярэднікаў і сучаснікаў: А. Міцкевіча ("Дзяды"), Т. Шаўчэнкі ("Сон"), Лесі Украінкі ("Лясная песня"), І. Франко ("Сон князя Святаслава") і інш. Пра гэта гаворыць некаторая арыентацыя Купалы на традыцыйную народную сімволіку, якую выкарыстоўвалі славянскія паэты, а тая, у сваю чаргу, аказвала ўплыў на стварэнне яркіх рамантычных характараў у творчасці паэта. Разам з гэтым нельга не адзначыць прыкметнага ўплыву на станаўленне Купалы як драматычнага паэта айчынных традыцый В.І. Дуніна-Марцінкевіча, асабліва яго паэмы "Гапон", у якой ужо тады выразна прагляdaліся контуры драматычнай кампазіцыі. Чатыры яе часткі – гэта, па сутнасці, чатыры драматычныя сцэны з выкарыстаннем дыялогавых формаў, рэплік і іншых прыёмаў паэтыкі драматычнага жанру. У гэтай сувязі хочацца нагадаць словы рускага паэта М. Рыленкова, які пісаў: "Беражлівыя адносіны да лепшых традыцый класічнай паэзіі зусім не азначае адмовы ад пошукаў новых шляхоў. Традыцыі заўсёды патрабуюць працягу, развіцця, інакш мастаку пагражае эпігонства" [13, с. 24]. Як бачым, з Купалам такога не здарылася. Эвалюцыйны шлях развіцця драматычнай паэмы ў аўтара адбываўся ўсвядомлена і мэтанакіравана. Улічваючы і развіваючы паэтычную спадчыну класікі, паэт здолеў, але ўжо на нацыянальнай глебе, з выключнай мастацкай паўнатой стварыць сапраўдныя шэдэўры драма-паэтычнага мастацтва, якія і да гэтага часу, гаворачы словамі М. Лазарука, "не маюць, бадай, аналогій у іншых літаратурах" [11, с. 143].

Асабліва хацелася б падкрэсліць тую ролю, якую Я. Купала адводзіў фальклору ў станаўленні і фарміраванні жанру драматычнай паэмы. Менавіта ўмелае выкарыстанне народнай сімволікі, міфалагічных вобразаў і іншых традыцыйных формаў фальклорнай паэтыкі ў "Адвечнай песні" і "Сне на кургане" давалі Купалу магчымасць шырока адлюстроўваць сацыяльныя і сацыяльна-бытавыя кантрасты. Народная творчасць у вялікай ступені дапамагла паэту ў стварэнні і лепцы драматычных характараў, адлюстраванні багатага свету ідэй і страсцей сваіх герояў. Таму іх вобразы атрымаліся жывымі, па-мастацку непаўторнымі і рамантычна прыўзнятымі.

Важна падкрэсліць, што драматычныя паэмы Я. Купалы "Адвечная песня" і "Сон на кургане" не маглі не аказаць актыўнага ўплыву на ўвесь ход далейшага развіцця гэтага

ўніверсальнага жанру ў нацыянальнай паэзіі. Вядома, што мастацкая мадыфікацыя кожнага жанру мае права на далейшае жыццё, калі гэты жанр падтрымліваюць і развіваюць майстры слова. Тыя адкрыцці, якія зрабіў мастак, адзначае М. Тычына ў артыкуле "Канцэпцыя жанру ў нацыянальнай прозе" [14, с. 41] , становяцца знаходкай для іншых літаратурных традыцый, з'яўляюцца "паветрам", якім дыхае сучасны чалавек. Такім чынам, паэтычныя адкрыцці Купалы не засталіся незаўважнымі. Яны былі падхоплены паэтамі розных стыляў і арыентацый як дакастрычніцкага перыяду, так і савецкага. У прыватнасці, К. Буйло пад непасрэдным уплывам купалаўскіх твораў стварыла "Кветку папараці", К. Каганец – "Старажовы курган" і "Сын Даніла", М. Клімковіч – "Кацярына Жарнасек", "Адплата", М. Чарот напісаў драматызаваную паэму "Сон на балоце". Апошні твор яўна блізкі да традыцый драматычных паэм Янкі Купалы. Нават пры павярхоўным знаёмстве з паэмай Чарота кідаецца ў вочы, што ўжо тады малады паэт выкарыстоўваў тыя ж самыя ўмоўна-вобразныя прыёмы, якія ў свой час былі паспяхова апрабіраваны Купалам у "Сне на кургане". Праўда, у адрозненне ад купалаўскіх шэдэўраў чаротаўская паэма напісана ў іншым паэтычным ключы, які адпавядаў канкрэтна-гістарычнаму зместу іншага часу. Аднак названыя вышэй творы нельга цалкам аднесці да жанру драматычнай паэмы па той прычыне, што ідэйна-мастацкай сутнасцю, сюжэтна-кампазіцыйнай будовай яны блізкія хутчэй да драматычных вершаваных абразкоў. І ўсё-такі яны былі прыкметнай з'явай у нацыянальнай паэзіі. І іх з'яўленне стымулявала далейшы ход развіцця жанравых мадыфікацый драматычнай паэмы, узбагачэнне яе новымі матывамі і вобразамі, новымі рытмамі і інтанацыямі.

Такім чынам, на пачатку XX ст. беларуская паэма грунтоўна закладвала і мацавала класічныя, стылёва-жанравыя асновы. І генезіс паэмнай творчасці Я. Купалы ў гэтым нас пераконвае, даючы каштоўны матэрыял для практычнага разумення жанрава-структурных асаблівасцей драматычнай паэмы.

**Літаратура**

1. Арочка, М. Саюз часу і майстэрства / М. Арочка. – Мн., 1981.
2. Э ЛіМ Беларусі. – Мн., 1985. – Т. 2.
3. Лазарук, М. Часу непадуладнае / М. Лазарук. – Мн., 1981.
4. Лазарук, М. Станаўленне беларускай паэмы / М. Лазарук. – Мн., 1968.
5. Ярош, М. Пясняр роднай зямлі / М. Ярош. – Мн., 1982.
6. Ярош, М. Драматургія Янкі Купалы / М. Ярош. – Мн., 1959.
7. Бярозкін, Р. Свет Купалы / Р. Бярозкін. – Мн., 1965.
8. Купала, Я. Збор твораў: у 7 т. / Я. Купала. – Мн., 1975. – 6 т.
9. Шотт, И.М. Фольклор в творчестве Янки Купалы / И.М. Шотт. – Мн., 1968.
10. Янка Купала. Энцыклапедычны даведнік. – Мн., 1996.
11. Лазарук, М. Беларуская паэма ў другой палавіне XIX – пачатку XX стагоддзя / М. Лазарук. – Мн., 1970.
12. Грынчык, М.М. Фальклорныя традыцыі ў беларускай дакастрычніцкай паэзіі / М.М. Грынчык. – Мн., 1969.
13. Рыленков, Н. Традиции и новаторство / Н. Рыленков. – М., 1962.
14. Адзінства і ўзаемаўзбагачэнне. – Мн., 1980.

*Паступіла 05.05.2008*